

# МАЛЕБЕН НА СЬВЯТУЮ ПАСХУ

Львоў
2007 л.Б.



Парахфія свт. Кірыла Тураўскага, г.Львоў

Аўтарызавана перакладзеныя

сьвятаром Сяржуком Горбікам

Дзеля служэньняў Беларускам Праваслаўнам Абрадзе

**Сьвятар:** Дабраслаўлёны Бог наш спрадвеку, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Чытальнік:** Амін.

**Сьвятар:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў. *(тры разы)*

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў. *(тры разы)*

**Сьвятар:** Няхай устане Бог, рассыпяцца ворагі Ягоныя, і тыя, што ненавідзяць Яго ўцякуць ад аблічча Ягонага.

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў.

**Сьвятар:** Як разьвяваецца дым, так разьвей іх; як воск ад агня.

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў.

**Сьвятар:** Так няхай нягоднікі загінуць перад абліччам Божым, але справядлівыя няхай радуюцца.

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў.

**Сьвятар:** Гэта той дзень, які ўчыніў Госпад; будзем радавацца і вясяліцца ў ім.

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў.

**Сьвятар:** Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў.

**Сьвятар:** Цяпер і заўсёды і на вякі вякоў. Амін.

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў.

**Іпакой, тон 4:** Устаўшы да сьвітаньня, жанчыны, што былі з Марыяй, убачылі камень, адвалены ад магілы, і пачулі ад анёла: “Навошта шукаеце сярод мёртвых, быццам чалавека, Таго, хто жыве ў вечнам сьвятле? Глянце, вось пахавальныя покрывы; дык ідзіце і сусьвету абвяшчайце, што Госпад уваскрос і зьнішчыў сьмерць, бо Ён - Сын Бога, які збаўляе род людзкі.”

## Песьня 1

**Ірмас:** Уваскрошаньня дзень! Прасьвятлімся, людзі праваслаўныя: сёньня Пасха Гасподняя, Пасха! Бо вось ад сьмерці да жыцьця і ад зямлі на нябёсы Хрыстос Бог наш узьняў нас, якія пяём сьпеў перамогі.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Ачысьцім нашыя пачуцьця, каб нам убачыць Хрыста ў нявымоўным зьзяньні ўваскрошаньня і пачуць, як Ён прамаўляе: Радуйцеся ўсе, што сьпяваюць песьню перамогі.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Нябёсы годна весяляцца, і радуецца зямля, увесь сусьвет, бачны і нябачны, сьвяткуе, бо ўваскрос Хрыстос, наша радасьць вечная.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

**Катавасія:** Уваскрошаньня дзень! Прасьвятлімся, людзі праваслаўныя: сёньня Пасха Гасподняя, Пасха! Бо вось ад сьмерці да жыцьця і ад зямлі на нябёсы Хрыстос Бог наш узьняў нас, якія пяём сьпеў перамогі.

Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў. *(тры разы)*

## Песьня 3

**Ірмас:** Хадзіце будзем піць пітво навое, не з каменя бясплоднага цудам атрыманае, але тое, што б’е жывой крыніцай з магілы Хрыста, які нас умацоўвае.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Сёньня ўсё напоўнілася сьвятлом - нябёсы, зямля і апраметная. Хай усё стварэньня сьвяткуе ўваскрошаньне Хрыста, які нас умацоўвае.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Учора я быў пахаваны з Табою, Хрысьце - сёньня Ты ўваскрос і я ўстал; учора я быў укрыжаваны з Табою - уславь мяне сёньня ў валадарстве Тваім

**Катавасія:** Хадзіце будзем піць пітво навое, не з каменя бясплоднага цудам атрыманае, але тое, што б’е жывой крыніцай з магілы Хрыста, які нас умацоўвае.



**Сьвятар:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў.

**Людзі:** І тым, што ў магілах жыцьцё падарыў.

**Сьвятар:** Хрыстос праўдзівы Бог наш, які ўваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў, і тым, што магілах жыцьцё падараваў, малітвамі ўсячыстае сваёй Маці, і ўсіх сьвятых хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

**Сьвятар:** Хрыстос уваскрос!

**Людзі:** Сапраўды ўваскрос!

**Сьвятар:**Хрыстос уваскрос!

**Людзі:** Сапраўды ўваскрос!

**Сьвятар:**Хрыстос уваскрос!

**Людзі:** Сапраўды ўваскрос!

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў. *(тры разы)*

І нам падарыў жыцьцё вечнае: пакланяемся ягонаму трохдзёнаму ўваскрошаньню.

жыцьцё, здароўе, посьпеху кожнай добрай справе, і каб адпусьціў яму/ёй/ім усе ягоныя/ейныя/іхнія правіны вольныя і міжвольныя.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся Госпаду Богу нашаму, каб Ён пачуў голас маленьняў нас, грэшных, і зьмілаваўся над слугою сваім/сваёю/слугамі сваімі... *(імя),* захаваў яго/яе/іх ад усякага суму, бяды, гневу і патрэбы, і ад усякае хворасьці душэўнае і цялеснае, і дараваў яму/ёй/ім здароўе і даўгалецьце. Скажам усе разам: Хутка пачуй нас і памілуй.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся, каб гэтаму гораду і гэтай сьвятой царкве, і ўсякаму гораду і краіне захавацца ад голаду, пошасьці, землятрусу, патопу, агню, мяча, нападу ворагаў і братабойчае вайны; і каб добры і чалавекалюбны Бог наш быў міласэрны і спагадлівы да нас, адхіліў ад нас усякую небясьпеку, што нам пагражае, вызваліў нас ад сванго справядлівага гневу і зьмілаваўся над намі.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся, каб Госпад Бог пачуў голас маленьня нас, грэшных, і зьмілаваўся над намі.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

**Сьвятар:** Выслухай нас, Божа, Збавіцелю наш, надзея ўсіх, што жывуць на зямлі, і тых, што далёка на моры, і будзь спагадлівы да нас, грэшных, і памілуй над намі. Бо Ты міласэрны і чалавекалюбны Бог, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Дыякан:** Прымудрасьць

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў. *(тры разы)*

***Вялікоднае слова сьв. Яна Златавуснага.***

*(На Вялідзень, дзе ёсьць звычай)*



**Дыякан:** Памілуй нас, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і памілуй.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** Яшчэ молімся за богалюбнага Сьвяцейшага Ўсяленскага патрыярха Канстантынопальскага, за ўладыку нашага (імя і тытул першаярарха) япіскапа нашага Пачэснага... *(імя)* і ўсіх у Хрысьце братоў нашых.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся за яго (яе) міласьць ... *(імя галавы дзяржавы),* за ўрад, належныя ўлады і ўсіх, што сьцерагуць цэласьці і спакою гэтае краіны.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся за Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся за слугу Божага (Божую, слугаў Божых)... *(імёны),* каб добры і міласэрны Бог наведаў яго (яе, іх) і дараваў яму (ёй, ім) спакойнае жыцьцё, здароўе, посьпех у кожнай добрай справе, і каб адпусьціў яму (ёй, ім) ўсе ягоныя (ейныя, іхнія) правіны вольныя і міжвольныя.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся за ўсіх тут прысутных людзей, якія чакаюць ад Цябе багацьця Твайго зьмілаваньня, за ўсіх братоў і сёстраў нашых, і за ўсіх праваслаўных хрысьціянаў.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

**Сьвятар:** Бо Твая ёсьць дзяржава і Тваё ўладарства, і сіла і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Іпакой, тон 4:** Устаўшы да сьвітаньня, жанчыны, што былі з Марыяй, убачылі камень, адвалены ад магілы, і пачулі ад анёла: "Навошта шукаеце сярод мёртвых, быццам чалавека, Таго, хто жыве ў вечнам сьвятле? Глянце, вось пахавальныя покрывы; дык ідзіце і сусьвету абвяшчайце, што Госпад уваскрос і зьнішчыў сьмерць, бо Ён - Сын Бога, які збаўляе род людзкі."

## Песьня 4

**Ірмас:** На боскай варце Богам натхнёны Авакум хай стане разам з намі і пакажа анёла прамяністага, які да нас прамовіць: Сёньня збаўленьня сусьвету, бо ўваскрос Хрыстос усямагутны.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Хрыстос зьявіўся нам як чалавек сьмяротны, з дзявочага ўлоньня; Ён - наша Пасха, што, як ягня бязьвіннае, граху ня ведае; як Бог праўдзівы, Ён дасканалы.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Быцца аднагадовае ягня, Хрыстос наш дабраславёны вянец і Пасха ачышчальная - быў дабраахвотна прынесены ў ахвяру за ўсіх, і вось з магілы зазьзяла нам Сонца справядлівасьці.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Богаайцец Давід радасна танцаваў перад каўчэгам Запавету, што быў толькі правобразам; мы ж, сьвяты народ Божы і сьведкі зьдзейсьненага, радуемся ў Боге, бо ўваскрос Хрыстос усямагутны.

**Катавасія:** На боскай варце Богам натхнёны Авакум хай стане разам з намі і пакажа анёла прамяністага, які да нас прамовіць: Сёньня збаўленьня сусьвету, бо ўваскрос Хрыстос усямагутны.

## Песьня 5

**Ірмас:** Устанем рана да сьвітанка і, замест духмянасьцяў, песьню Ўладару прынясем, і ўбачым Хрыста, Сонца справядлівасьці, што асьвятляе ўсім жыцьцё.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.



**Катавасія:** Сьвяціся, сьвяціся, Навы Ерусаліме, бо слава Госпада зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне. Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго Ты нарадзіла, з мёртвых устаў.

**Людзі:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё падарыў. *(тры разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў!

Устаўшы да сьвітанку, жанчыны, што былі з Марыяй, убачылі камень, адвалены ад магілы, і пачулі ад анёла: "Нашто шукаеце сярод мёртвых, быццам чалавека, Таго, хто жыве ў вечнам сьвятле? Глянце, вось пахавальныя пакровы; дык ідзіце і сусьвету абвяшчайце, што Хрыстос Госпад уваскрос і зьнішчыў сьмерць, бо Ён - Сын Бога, які збаўляе род людзкі."

**Кандак:** Хоць Ты, Несьмяротны, і зышоў у магілу, Ты зьнішчыў уладу ада і ўваскрос пераможна, Хрыстос Бог, жанчынам міраносіцам прамаўляючы: "Радуйцеся" - і Тваім Апосталам супакой падаючы, Ты, што даеш памёршым уваскрошаньня.

**Дыякан:** Памілуй над намі, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці, молімся Табе, пачуй нас і памілуй.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** Яшчэ молімся за богалюбнага Сьвяцейшага Ўсялнскага патрыярха Канстантынопальскага, за ўладыку нашага (імя і тытул першаярарха) япіскапа нашага Пачэснага... *(імя)* і ўсіх у Хрысьце братоў нашых.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся за Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй; Госпадзе, памілуй.

Яшчэ молімся за слугу Божага/Божую *...(гмя),* каб добры і міласэрны Бог наведаў яго/ яе/іх і дараваў яму/ёй/ім спакойнае

Хадзіце, у гэты ўрачысты дзень Уваскрошаньня пакаштуем новага плоду вінаграднага, радасіць Божай і ўладарства Хрыстовага, і ўславім Яго на ўсе вякі.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Глянь навокал, Сыёне, і бач: вось прыйшлі да цябе, быццам Боскія сьветачы, з захаду і поўначы, з поўдня і ўсходу дзеці твае, дабраслаўляючы Хрыста на ўсе вякі.

Дабраславім Айца, і Сына, і Сьвятога Духа - Госпада цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча ўсямагутны, І сыне, і Духу, адзіная ў трох асобах існасьць, надпрыродная і найвышэйшая Боскасьць, у Цябн мы ахрысьціліся, Цябе дабраслаўляем на ўсе вякі.

**Прысьпеў:** Хвалім, праслаўляем, пакланяемся Госпаду, асьпяваючы і славячы Яго на ўсі вякі.

**Катавасія:** Гэты асаблівы і сьвяты дзень, адзіны з усіх сыботаў, Уладарны Господні, сьвята над сьвятамі і ўрачыстасьць над урачыстасьцямі: у гэты дзень дабраслаўляем Хрыста на ўсе вякі.

**Сьвятар:** Богародзіцу і Маці Сьвятла ў сьпевах прыславім!

**Людзі:** Анёў спавясьціў дабрадатны: “Чыстая Дзева радуйся! І зноў прамаўляю: Радуйся! Твой Сын ўваскрос на трэці дзень і з магілы і памёрлых уваскрасіў. Людзі весяліцеся.

## Песьня 9

**Ірмас:** Сьвяціся, сьвяціся, Навы Ерусаліме, бо слава Госпада зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне. Ты ж, Чыстая, красуйся, Богародзіца, бо Той, каго Ты нарадзіла, з мёртвых устаў.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

О Боскае, о любае, о найсьвятое слова Тваё: Ты, Хрысьце, абяцаў быць з намі да канца сусьвету. Мы ж, што жывём з гэтае надзеяй, радуемся.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Ты, Хрыстос, наша вялікая і сьветлая Пасха, Слова Боскае, Мудрасьць і Сіла. Дай нам больш дасканала зьяднацца з Табой ў незаходны дзень уладарства Твайго.



Убачыўшы бязмежную міласэрнасьць Тваю, Хрыстос, усе, зьвязаныя путамі пякельнымі, вясёлым крокам пасьпяшылі да сьвятла і ўславілі Пасху вечную.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Са сьвечкамі ў руках выёдзем насустрач Хрысту, які, быццам жаніх, з магілы выходзіць, і разам са сьвяточным натоўпам уславім Пасху Боскую, збавенную.

**Катавасія:** Устанем рана да сьвітанка і, замест духмянасьцяў, песьню Ўладару прынясем, і ўбачым Хрыста, Сонца справядлівасьці, што асьвятляе ўсім жыцьцё.

## Песьня 6

**Ірмас:** Ты, Хрыстос, зышоў у глыбіны падземныя і разбіў вечныя ланцугі, што трымалі вязьняў, і на трэці дзень, быццам Ёна з нутра кіта, устаў з магілы.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Захаваўшы някранутымі пячаткі, Ты, Хрыстос, што не парушыў дзявоцтва нараджэньням Тваім, уваскрос з мёртвых і адчыніў нам райскую браму.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Збаўца мой, жывая і несьмяротная ахвяра, Ты як Бог дабраахвотна прынёс сябе ў ахвяру Айцу і, уваскросшы з мёртвых, узьняў з сабой праайца Адама і ўвесь род людзкі

**Катавасія:** Ты, Хрыстос, зышоў у глыбіны падземныя і разбіў вечныя ланцугі, што трымалі вязьняў, і на трэці дзень, быццам Ёна з нутра кіта, устаў з магілы.

**Дыякан:** Яшчэ і яшчэ ў супакоі Госпаду памолімся.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

**Людзі:** Госпадзе, памілуй.

**Дыякан:** Успамянуўшы найсьвятую, усячыстую, Найдабраслаўлёную, слаўную Ўладарку нашу Богародзіцу і Заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

**Людзі:** Табе, Госпадзе.

**Сьвятар:** Бо Ты Ўладар сьвету і Збавіцель душаў нашых, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

*Тут можа чытацца акафіст*

**Кандак:** Хоць Ты, Несьмяротны, і зышоў у магілу, Ты зьнішчыў уладу ада і ўваскрос пераможна, Хрыстос Бог, жанчынам міраносіцам прамаўляючы: “Радуйцеся” - і Тваім Апосталам супакой падаючы, Ты, што даеш памёршым уваскрошаньня.

**Ікас:** Устаўшы да сьвятанку, жанчыны выйшлі шукаць, быццам дня, Сонца, што было раней за сонца і зайшло ў магілу, і казалі адна адной: “Пойдзем, сяброўкі, памажам духмянымі алейямі ў магіле жыцьцядаўчае цела Таго, хто ўваскрасіў памёршага Адама; пойдзем хутка і, як некалі мудрацы, прынясем у дар духмянае міра Таму, хто дяжыць, спавіты не ў пялёны, але ў пахавальнае палатно; заплачам і ўсклікнем: Устань, Уладар, Ты, што даеш памёрлым уваскрошаньня!”

**Дыякан:** Будзьма ўважлівыя. Мудрасьць, слухайма ўважліва!

**Пракімен:** Вось дзень, што Госпад стварыў, дзнь радасьці і вясёласьці дзеля ўсіх нас. Аддайце падзяку Госпаду, бо Ён добры, бо вечна міласэрнасьць Яго.

**Апостал:** Дз. 1, 1:8 *(чытаецца на Вялікдзень)*
*(пры звычае і патрэбе тут чытаецца Апостал дня)*

**Алілуяр:** Ты Госпад, уваскросшы, зьлітуешся на Сыёнам, бо ўжо час паказаць спагаду Тваю яму, бо ўжо прыйшоў час.

**Дыякан:** Прымудрасьць

**Дыякан:** Мудрасьць, устаньце, будзем слухаць Сьвятое Евангельле.

**Сьвятар:** Мір усім.

**Людзі:** І твайму духу.

**Сьвятар:** Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле...

*Калі ў нядзелю Пасхі: сьв. Яна.*

*У нішыя дні Пасхі: сьв. Лук.*

**Людзі:** Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.



**Дыякан :** Слухаем уважна!

**Евангельля:**

*Калі ў нядзелю Пасхі: сьв. Яна, пач 1.*

*У нішыя дні Пасхі: сьв. Лукі, пач. 114.*

**Людзі:** Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

## Песьня 7

**Ірмас:** Той, хто выбавіў юнакоў з агню, стаўшы чалавекам, церпіць, як сьіяротны, і цярпеньням сваім сьмяротнае апранае ў прыгажосьць несьмяротнасьці - адзіны найдабраслаўлёны Бог Айцоў і ўсямагутны.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Богамудрыя жанчыны-міраносіцы з дабрапахучымі алеямі пасьпяшылі сьледам за Табой і, шукаючы з сьлязамі памёршага, радасна пакланіліся Богу і Пасху таемную вучням Тваім, Хрысьце, абвясьцілі.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Сьвяткуем сьмерцт сьмерць, аду зьнішчэньня і новага, вечнага жыцьця пачатак і, радуючыся, славім Падставу ўсяго, што здарылася, адзінага дабраслашлёнага Бога Айцоў і ўсяслаўнага.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.

Сапраўды сьвятая і ўрачыстая гэтая збаўленьня ноч, і прамяністая прадвесьніца дня ўваскрошаньня, у які Спрадвечнае Сьвятло цялесна ўсім з магілы зазьзяла

**Катавасія:** Той, хто выбавіў юнакоў з агню, стаўшы чалавекам, церпіць, як сьіяротны, і цярпеньням сваім сьмяротнае апранае ў прыгажосьць несьмяротнасьці - адзіны найдабраслаўлёны Бог Айцоў і ўсямагутны.

## Песьня 8

**Ірмас:** Гэты асаблівы і сьвяты дзень, адзіны з усіх сыботаў, Уладарны Господні, сьвята над сьвятамі і ўрачыстасьць над урачыстасьцямі: у гэты дзень дабраслаўляем Хрыста на ўсе вякі.

Хрыстос уваскрос з мёртвых.